www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

23 лістапада 2006 года, № 19 (1949)

КОЛЛЕКТИВУ БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА

Дорогие друзья!

Сердечно поздравляю вас с 85-летием со дня основания Белорусского государственного университета.

За годы плодотворной работы университет превратился в крупнейший интеллектуальный и культурный центр, получивший мировое признание. В вузе подготовлены десятки тысяч квалифицированных специалистов, которые вносят значительный вклад в развитие системы государственного управления, экономики и социальной сферы, сформировались научные школы по многим направлениям исследований, созданы прекрасные условия для учебы, работы и отдыха.

Белорусский государственный университет по праву является ведущим высшим учебным заведением в национальной системе образования, чей диплом высоко ценится в нашей стране и за рубежом.

Впечатляющие достижения — итог дружной и слаженной работы всех студентов, преподавателей и сотрудников университета. Пусть ваш замечательный коллектив и в дальнейшем трудится столь же активно и плодотворно, дорожит честью родного вуза и преумножает его добрую славу.

Желаю вам крепкого здоровья, отличной учебы, научных открытий, успехов во всех делах и начинаниях, счастья и хорошего настроения.

Александр ЛУКАШЕНКО, Президент Республики Беларусь

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

СТУДЭНТЫ ГОДА

Інтэрв'ю з пераможцамі студэнцкага конкурсу ў БДУ

Стар. 3

ДА ПЕРАМОГІ ПРАЗ «ЕЎРОПУ»

Гутарка з камандзірам найлепшага студэнцкага будатрада Аляксандрам Ілюком

Стар. 4

БДУ РУХАЕЦЦА Ў БУДУЧЫНЮ, ПАМЯТАЮЧЫ І ШАНУЮЧЫ СВАЮ ГІСТОРЫЮ

Прамова рэктара прафесара Васіля Стражава з нагоды 85-годдзя БДУ

Паважаныя госці, калегі і студэнты!

Менавіта сёння, 30 кастрычніка, але ў 1921 годзе, адбылося ўрачыстае адкрыццё Беларускага дзяржаўнага універсітэта. А на наступны дзень у будынку на вуліцы Чырвонаармейскай, зусім побач з гэтай залай, прафесар-гісторык Дзмітрый Пятровіч Канчалоўскі прачытаў першую лекцыю студэнтам факультэта грамадскіх навук аб культуры Міжземнамор'я ў эпоху панавання Рыма.

Так пачала дзейнічаць на Беларусі першая ў XX стагоддзі вышэйшая навучальная ўстанова, імя якой ужо вядома зараз ва ўсім свеце — Беларускі дзяржаўны універсітэт.

У кожнай краіне нацыянальны універсітэт лічыцца адным з яе асноўных сімвалаў. Падставы для гэтага зразумелыя. Універсітэты па сваёй асветніцкай ролі з'яўляюцца падмуркам для развіцця нацыянальнай культуры, адукацыі і навукі. Гэта, безумоўна, справядліва і ў дачыненні да БДУ.

У жыцці БДУ можна выдзеліць чатыры асноўныя этапы. Першы ахоплівае перыяд з моманту ўтварэння універсітэта ў 1921 годзе і да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Гэта быў час станаўлення і сталення. Ваенныя гады ў жыцці БДУ — асобая старонка гісторыі. Перыяд пасля вайны і да 1961 года можна назваць этапам адраджэння і пад'ёму. А часам пераўтварэнняў і росквіту універсітэта, часам, калі БДУ ўвайшоў у эліту савецкай сістэмы вышэйшай школы і ў лік вядучых еўрапейскіх універсітэтаў, па праву лічыцца перыяд з 1961 па 1991 гг. Сёння мы пражываем чацвёрты этап жыцця БДУ — нацыянальнага універсітэта новай, маладой, незалежнай дзяржавы — Рэспублікі Беларусь.

Мне прыемна адзначыць, што ў мінулую пятніцу, 27 кастрычніка, адбылося ўрачыстае адкрыццё музея гісторыі БДУ. З 1977 па 1997 гг. такі музей ва універсітэце існаваў. Адраджаць яго трэба было ўжо на падставе новай канцэпцыі і ў новым фармаце, разглядаючы музей як адзін з асноўных цэнтраў выхавання студэнцтва ў духу патрыятызму і грамадзянскасці. Мы пачалі гэту працу ў 2005 г., і я хацеў бы выказаць шчырую падзяку ўсім тым, хто зрабіў такі вялікі падарунак да 85-годдзя універсітэта.

І гэта не адзіны падарунак. Да 85-годдзя БДУ ва універсітэце выдадзена кніга "БДУ — 1921—1941 гады". Храналагічна яна адкрывае серыю па гісторыі універсітэта, але па часе выдання яна другая. У мінулым годзе ўбачыла свет кніга "БДУ ў гады Вялікай Айчыннай вайны".

Такія выданні неабходна разглядаць як важны складнік вучэбна-выхаваўчага працэсу. Адзначу вялікі ўнёсак у стварэнне гэтых кніг выкладчыкаў гістарычнага факультэта і спецыялістаў упраўлення рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ. У наступныя тры гады мы працягнем гэту гістарычную серыю і выпусцім яшчэ два зборнікі "БДУ — 1945—1961 гады" і "БДУ — 1961—1991 гады".

Мае словы ўдзячнасці і факультэту журналістыкі. Творчая група журфака да 85-годдзя зрабіла відэафільм пра наш універсітэт. Гэта першая спроба стварэння фільма пра БДУ, які мы будзем актыўна выкарыстоўваць у культурнай і ідэйна-выхаваўчай рабоце са студэнтамі. Яго прэзентацыя адбудзецца заўтра на ўрачыстым пасяджэнні Вучонага савета універсітэта. Пабачыў свет таксама фотаальбом пра БДУ.

Музей, кнігі, фільм — кожная з гэтых пазіцый дае вобразнае і ёмістае ўяўленне пра гісторыю БДУ, а яна, у сваю чаргу, цесна звязана з гісторыяй беларускай дзяржаўнасці.

У снежні 1917 года стварэнне нацыянальнага універсітэта разам з іншымі вострымі праблемамі абмяркоўвалі дэлегаты Усебеларускага з'езда саветаў. А ў 1918 годзе гісторык Доўнар-Запольскі і філолаг-этнограф Карскі распрацавалі ўжо першы Статут універсітэта.

Іх ініцыятыва атрымала рэальнае ўвасабленне пасля стварэння ў 1919 годзе Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, кіраўніцтва якой вызначыла гэту задачу, цытую, як "тэрміновую" і "ўдарную". Арганізацыйная работа, аднак, зацягнулася ў сувязі з часовай акупацыяй Мінска польскімі войскамі. Толькі 30 кастрычніка 1921 года адбылося афіцыйнае адкрыццё БДУ. Яго першым рэктарам стаў знакаміты гісторык-славіст Уладзімір Іванавіч Пічэта — знакавая асоба не толькі для універсітэта, але і для ўсёй Беларусі.

Пад яго кіраўніцтвам БДУ пераўтварыўся ў буйны навуковы, вучэбны і культурны цэнтр, у якім былі сабраны найлепшыя інтэлектуальныя сілы, прычым не толькі Беларусі. Да ўтварэння БДУ спрычыніліся прадстаўнікі Маскоўскага, Казанскага, Кіеўскага і іншых універсітэтаў. Аўтарытэт Пічэты і яго вялікія асабістыя намаганні садзейнічалі таму, што ў Мінск пераехалі многія вядомыя прафесары з Расіі, Польшчы, Украіны. Па сваім выкладчыцкім складзе БДУ не саступаў многім дарэвалюцыйным ВНУ царскай Расіі.

Заканчэнне на стар. 2

ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

У сувязі з 85-годдзем БДУ 120 супрацоўнікаў і выкладчыкаў Белдзяржуніверсітэта атрымалі ганаровыя узнагароды ад Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, а таксама ад шэрага міністэрстваў і ведамстваў. Звыш 300 адзначаны кіраўніцтвам БДУ.

Рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў абраны старшынёй Беларускай асацыяцыі садзейнічання ААН, а падчас святкавання 85-годдзя БДУ стала вядома, што ён абраны ганаровым доктарам Расійскага дзяржаўнага сацыяльнага універсітэта.

Рэктар БДУ Васіль Стражаў і прарэктар, дэкан ФПМІ Павел Мандрык наведалі Магілёўскі дзяржаўны універсітэт, дзе сустрэліся з прафесарска-выкладчыцкім саставам. Павел Мандрык пазнаёміў калег з вопытам нашага універсітэта ў выкарыстанні і развіцці інфармацыйных тэхналогій пры забеспячэнні самастойнай працы студэнтаў. Акрамя таго, прадстаўнікі БДУ прынялі ўдзел у святкаванні з нагоды ўтварэння Беларуска-Расійскага універсітэта.

Дырэктар НДІ ФХП Алег Івашкевіч падчас візіту ў Карэю правёў перамовы аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве з вядучымі НДІ і ВНУ. Адным з вынікаў гэтага візіту стала падпісанне ў Мінску Мемарандума аб узаемаразуменні паміж БДУ і Карэйскім агенцтвам прамысловасці, матэрыялаў і кампанентаў (Korea Material & Components Industry Agency).

Людміла Хухлындзіна зага дам рэктара БДУ прызначана начальнікам Галоўнага управлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы Белдзяржуніверсітэта. Раней Людміла Міхайлаўна займала пасаду намесніка дэкана ФМА.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

БДУ РУХАЕЦЦА Ў БУДУЧЫНЮ, ПАМЯТАЮЧЫ І ШАНУЮЧЫ СВАЮ ГІСТОРЫЮ

Прамова рэктара прафесара Васіля Стражава з нагоды 85-годдзя БДУ

Заканчэнне. Пачатак на стар. 2

Першапачаткова універсітэт складаўся з трох факультэтаў — працоўнага, медыцынскага і грамадскіх навук. Да заняткаў у першым навучальным годзе прыступілі 1390 чалавек. Іх вучылі 49 выкладчыкаў. У 1925 годзе адбыўся першы выпуск маладых спецыялістаў.

У тым жа годзе быў створаны юрыдычны факультэт. А ў 1927 годзе — адкрыта аспірантура і пачалося будаўніцтва студэнцкага гарадка. У 1930/1931 навучальным годзе ў адпаведнасці з рашэннем Саўнаркама БССР на базе факультэтаў універсітэта створаны шэраг самастойных інстытутаў: Мінскі медыцынскі, Народнай гаспадаркі, Мінскі юрыдычны, Політэхнічны і Вышэйшы педагагічны. Новыя ВНУ з часам ператварыліся ў найбуйнейшыя навучальныя ўстановы рэспублікі.

Рэарганізацыйны перыяд у той жа час у значнай ступені аслабіў дзейнасць універсітэта. Многія буйныя навукоўцы перайшлі на працу ў новыя навучальныя ўстановы. Колькасць студэнтаў БДУ скарацілася да 436. Гэты часовы спад супаў, да таго ж, з найбольш складаным і супярэчлівым перыядам у жыцці універсітэта і савецкай краіны ў цэлым — перыядам рэпрэсій.

Рэаліі гэтага часу замарудзілі развіццё універсітэта, але не спынілі.

Напярэдадні 20-гадовага юбілею БДУ складаўся з 6 факультэтаў, 33 кафедраў, і ў ім працавалі 148 чалавек прафесарска-выкладчыцкага складу. Усяго вучыліся 1337 студэнтаў.

Вайна нанесла вялікія страты БДУ. Практычна цалкам быў разбураны універсітэцкі гарадок. Але 15 мая 1943 года Саўнаркам БССР прыняў пастанову "Аб узнаўленні работы Беларускага дзяржаўнага універсітэта". Месца для яго было вызначана недалёка ад Масквы на станцыі Сходня. Маскоўскі універсітэт разам з іншымі ВНУ сталіцы перадаў вялікую колькасць вучэбнага і навуковага абсталявання, падручнікаў і наглядных дапаможнікаў. У кастрычніку 1943 года да заняткаў прыступілі каля 300 чалавек, з імі працавалі 90 выкладчыкаў.

У Мінск першая група беларускіх студэнтаў вярнулася ў жніўні 1944 года, а ўвосень пачаліся рэгулярныя заняткі. У 1945/1946 навучальным годзе з 895 студэнтаў 121 былі дэмабілізаваныя з войска, 76 з'яўляліся ўдзельнікамі партызанскага руху.

Адзначу тут такі цікавы факт, які сведчыць аб значнасці БДУ ў рэспубліцы. Прадстаўнікі Белдзяржуніверсітэта прафесары Перцаў і Шмыгаў у складзе дэлегацыі БССР прынялі ўдзел у сан-францыскай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН і 26 чэрвеня 1945 года паставілі свае подпісы пад Статутам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Пасля вайны пачаўся новы этап ў развіцці БДУ. Даваенная вучэбна-навуковая і вытворчая база універсітэта ў асноўным аднавілася да 1950 года.

І ў 1957 годзе на сямі яго факультэтах (яшчэ ў 1944 годзе быў адкрыты факультэт журналістыкі) ужо налічваліся 43 кафедры, на якіх працавалі 339 выкладчыкаў.

У гэтым жа годзе рэктарам універсітэта стаў вядомы савецкі фізік Антон Нікіфаравіч Сеўчанка, з імем якога звязана цэлая эпоха ў гісторыі БДУ. Эпоха пераўтварэнняў і поспехаў.

У гісторыі БДУ асаблівае месца належыць двум яго рэктарам: першаму — Уладзіміру Іванавічу Пічэту і адзінаццатаму — Антону Нікіфаравічу Сеўчанку, выпускніку БДУ, які ў даваенны час паехаў на вучобу ў аспірантуры ў Ленінград і зрабіў там бліскучую навуковую кар'еру фізіка. У 1957 годзе ён вярнуўся ў родную для яго Беларусь дырэктарам Інстытута фізікі і матэматыкі АН БССР, а затым стаў рэктарам БДУ. І, як паказаў час, раўназначным з Пічэтам па значэнні для развіцця універсітэта.

І таму справядліва, што Вучоным саветам БДУ ў 1993 годзе было прынята рашэнне аб увядзенні ва універсітэце прэмій імя Пічэты (у галіне гуманітарных навук) і імя Сеўчанкі (у галіне дакладных і прыродазнаўчых навук). Заўтра на пасяджэнні Вучонага савета адбудзецца чарговае ўручэнне такіх прэмій.

У.І. Пічэта быў рэктарам БДУ на працягу васьмі гадоў, а А.Н. Сеўчанка — на працягу пятнаццаці гадоў, з 1957 па 1972 год, пасля чаго ён узначаліў Інстытут прыкладных праблем БДУ, які зараз носіць яго імя.

У спадчыну А.Н. Сеўчанку дастаўся комплекс як дасягненняў, так і вялікіх праблем. БДУ ўжо валодаў навуковым патэнцыялам, які, аднак, не мог рэалізавацца ў поўнай ступені з-за дрэннага стану вучэбнай і навуковай базы. Высокакваліфікаваныя спецыялісты і студэнты працавалі амаль у экстрэмальных умовах. Універсітэт меў толькі чатыры навучальныя карпусы агульнай плошчай 11 тыс. м ^{2}, востра неставала лабараторных памяшканняў і месцаў у інтэрнатах.

21 мая 1957 года Савет Міністраў БССР прыняў пастанову пра будаўніцтва галоўнага корпуса БДУ. 2 ліпеня 1958 года быў закладзены фундамент новага будынка. І да пачатку 1962 года БДУ атрымаў 24 тыс. м ^{2} дадатковых плошчаў, з якіх 16 тыс. м ^{2} — навучальных, г.зн. навучальныя плошчы універсітэта павялічыліся ў 2,5 разу.

Адкрыццё галоўнага корпуса стала вяхой у жыцці БДУ. Універсітэт атрымаў магчымасць для развіцця "старых" і стварэння новых факультэтаў, кафедраў, лабараторый.

Невялікае адступленне асабістага характару. Лёс вызначыў так, што, пачынаючы з А.Н. Сеўчанкі, які, нагадаю, быў адзінаццатым рэктарам БДУ, я быў знаёмы з усімі маімі папярэднікамі на гэтай пасадзе, а я ўжо семнаццаты рэктар БДУ. Увосень 1961 года як студэнт першага курса фізфака я ўпершыню ўбачыў рэктара на сустрэчы з першакурснікамі. У лютым 1962 года ўпершыню ў жыцці апынуўся ў рэктарскім кабінеце. Прычына была простай. Літаральна на другі дзень заняткаў у новым галоўным корпусе універсітэта было разбіта вельмі дэфіцытнае па тых часах шкло вялікага акна, што выходзіла на плошчу Леніна, як яна тады называлася. Падазрэнне пала на маіх аднакурснікаў, а ў сувязі з тым, што я быў сакратаром камсамольскага бюро курса, рэктар выклікаў мяне да сябе, каб, па-першае, вызначыць вінаватага, а па-другое, заклікаць праз мяне студэнтаў быць ашчаднымі ў захаванні іх жа маёмасці. Вінаватага, на шчасце, знайшлі амаль адразу ж і без мяне. І ён не быў маім аднакурснікам. Але ўрок таго, што ўсе мы — і прафесары, і студэнты — разам, а таму нясём адказнасць за наш універсітэт, я тады атрымаў і імкнуся яму следаваць і сёння — у цяперашнім жыцці універсітэта.

Да 50-гадовага юбілею ў 1971 годзе ў БДУ было 15 факультэтаў, якія складаліся з 91 кафедры. У 1971/1972 навучальным годзе ва універсітэце навучаліся 9087 студэнтаў на дзённым, 3174 на вячэрнім, 4751 на завочным аддзяленнях, у тым ліку 300 замежных грамадзян з 31 краіны свету. Прафесарска-выкладчыцкі склад налічваў 1136 чалавек. Час з 1960 па 1980 год стаў тым часам, калі БДУ канчаткова набыў класічную форму універсітэцкай навучальнай установы.

З сярэдзіны 80-х гадоў XX ст. Беларусь, як і іншыя рэспублікі СССР, увайшла ў эпоху радыкальных эканамічных і сацыяльных пераўтварэнняў, якія суправаджаліся працэсам рэфармавання вышэйшай школы. Здабыццё нацыянальнай незалежнасці паставіла перад універсітэтам новыя задачы, якія ён выконвае ў рамках сваёй асаблівай місіі ў грамадстве.

І сёння я хацеў бы выказаць словы шчырай падзякі кіраўніку краіны, Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Аляксандру Рыгоравічу Лукашэнку за ўвагу кіраўніцтва краіны да універсітэта і за яго падтрымку, без чаго стала б немагчымым значнае ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы БДУ. Прыгадаю толькі асобныя моманты.

У мінулым 2005 годзе ўведзены корпус юрыдычнага факультэта. У бягучым навучальным годзе завершаны капітальны рэмонт спорткомплексу "Універсітэцкі". Адзначу, што раней ён не меў назвы. У 2007 годзе ўводзіцца доўгачаканы будынак гуманітарных факультэтаў па вуліцы Кальварыйскай. А ў 2008 годзе факультэт міжнародных адносінаў пачне функцыянаваць у будынку на Прывакзальнай плошчы.

Па сутнасці, у бліжэйшыя 10—15 гадоў прадбачыцца не будаўніцтва вучэбнага фонду, а этап яго капітальнага рамонту і рэканструкцыі, бо існуючыя — дастатковыя для забеспячэння вучобы 20 тыс. студэнтаў дзённай формы навучання і 5 тыс. завочнікаў. Гэта лічбы, якіх мы дасягнем у 2008 годзе.

Канечне, неабходна пабудаваць яшчэ як мінімум два інтэрнаты. Гэта патрабуецца як для паляпшэння ўмоў жыцця нашага студэнцтва, так і для пашырэння прыёму замежных студэнтаў. Адзначу ў сувязі з гэтым, што, пачынаючы з 2004 года, мінчане складаюць менш за 40 працэнтаў ад студэнтаў, якія паступаюць у БДУ, тады як раней яны складалі большасць. Патрэбны і невялікі спорткомплекс у Шчомысліцы, дзе размяшчаюцца тры факультэты з агульнай колькасцю студэнтаў больш за 3 тыс. І, вядома, ёсць патрэба ў будынку сацыяльна-культурнага прызначэння, месца для якога мы зарэзервавалі ва ўнутраным дворыку БДУ на месцы знесенага старога будынка медінстытута.

Трэба будзе таксама праводзіць вялікую работу па абнаўленні прынцыпаў, зместу і формаў вучэбна-выхаваўчай работы, па захаванні і развіцці навуковага патэнцыялу БДУ, інавацыйнай дзейнасці, звязанай у тым ліку з выкарыстаннем усіх магчымасцей унітарных прадпрыемстваў БДУ. Дазвольце мне ў гэтым кароткім дакладзе спыніцца больш падрабязна толькі на вучэбна-выхаваўчым аспекце разнастайнага жыцця БДУ.

Прывычная для нас мадэль вышэйшай школы ўсё больш прыходзіць у супярэчнасць не толькі з рэаліямі будучага дня, але і з рэаліямі ўжо дня мінулага. Першаснай задачай вышэйшай школы становіцца падрыхтоўка не проста высокакваліфікаванага спецыяліста. На ўсё жыццё, як стала зразумела, у ВНУ не навучыш. Неабходна навучыць студэнтаў уменню самім набываць новыя веды, нарошчваць уласны творчы патэнцыял. Іншага спосабу дасягнуць такога выніку, чым зрабіць студэнта актыўным удзельнікам адукацыйнага працэсу, не існуе. Рэцэпт просты, рэцэпт вядомы. Але, як паказвае жыццё, лёгка дасягальным ад гэтага ён не становіцца.

Перш за ўсё патрабуе абнаўлення характар навучальнага працэсу, форма арганізацыі. Другая акалічнасць, цесна звязаная з першай, абумоўлена, канечне, пераходам да масавай вышэйшай адукацыі, які адбыўся ў нашай краіне за дастаткова кароткі прамежак часу. Гэты факт акажа (і ўжо аказвае!) значнае ўздзеянне на сацыяльную структуру грамадства, стварае патэнцыяльна іншыя магчымасці для праяўлення ролі і значэння чалавечага капіталу. Такі сацыяльны эфект з часам можа стаць істотным у працэсе абнаўлення грамадства і развіцця эканомікі. Але значнае павелічэнне прыёму ў ВНУ абвастрыла многія праблемы ў сістэме вышэйшай адукацыі. У Белдзяржуніверсітэце мы бачым вырашэнне праблемы забеспячэння якасці масавай падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у актыўным выкарыстанні інфармацыйных тэхналогій.

Вучоны савет БДУ ў чэрвені 2004 года зацвердзіў комплекс мер па развіцці універсітэта да 2011 года — года 90-годдзя БДУ. Адной з галоўных, калі не самай галоўнай, стала праграма "Удасканальванне арганізацыі, забеспячэння і кантролю якасці самастойнай работы студэнтаў". Былі выдзелены чатыры "пілотныя" факультэты: радыёфізічны, прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, гістарычны і геаграфічны. Акрамя развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы гэтых факультэтаў (аснашчэнне кафедраў, стварэнне новых камп'ютарных класаў) у 2006 г. былі створаны камп'ютарныя класы-медыятэкі на 111 месцаў, надзённая неабходнасць якіх ужо даказана іх папулярнасцю сярод студэнтаў. І мы працягнем стварэнне такіх медыятэк. Студэнтам БДУ забяспечаны поўны доступ да ўсіх агульнаўніверсітэцкіх электронных адукацыйных рэсурсаў, што ёсць і ствараюцца ў БДУ, а таксама да адукацыйных рэсурсаў сваіх факультэтаў.

У 2005/2006 навучальным годзе асноўная ўвага рэктарата была скіраваная на практычнае ўкараненне інфармацыйных тэхналогій на "пілотных" факультэтах, стварэнне ўмоў для адпаведнай самастойнай работы ўсіх студэнтаў БДУ. Курс на інфарматызацыю самастойнай работы студэнтаў патрабаваў правядзення вялікага комплексу арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў.

Адзначу, што ў рамках выканання рашэння Вучонага савета 2004 года ў БДУ на аснове інфармацыйных тэхналогій створана ўласная сістэма кіравання навучальным працэсам, унікальная, адзіная, якой раней не існавала на постсавецкай прасторы.

Але ўсё адзначанае вышэй — толькі пачатак вельмі вялікай, карпатлівай і зусім няпростай работы па перабудове арганізацыі навучальнага працэсу. Яна, як ужо становіцца відавочным, патрабуе і істотнага перагляду зместу вучэбных планаў і праграм і г.д.

За два апошнія гады мы прайшлі знешне пакуль не заўважны шлях, але рэальныя змены пачаліся. Мы іх ужо бачым. Праз некалькі год іх убачаць усе. Беларускі дзяржаўны універсітэт знаходзіцца ў пастаянным руху, імкнучыся да развіцця і ўдасканалення, памятаючы і шануючы сваю гісторыю. Разам з тым, як і роданачальнікі Белдзяржуніверсітэта, мы, іх нашчадкі, скіраваныя ў будучыню. Нам толькі 85! І я ад душы віншую ўсіх вас з гэтай цудоўнай і знамянальнай датай!

Рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта прафесар Васіль СТРАЖАЎ

ПАДЗЕІ

УНІВЕРСІТЭТ ЯК НА ДАЛОНІ

Да свайго 85-годдзя БДУ атрымаў цудоўны падарунак — фотаальбом, падрыхтаваны выдавецтвам "Рифтур". Кніга змяшчае вялікую колькасць якасных фотаздымкаў будынкаў, карпусоў, аўдыторый і лабараторый з выкладчыкамі і студэнтамі, выкананых з вялікім мастацкім густам і з незвычайных ракурсаў, нават з борта верталёта. Акрамя таго, у альбоме даецца цікавая інфармацыя пра багатую мінуўшчыну Белдзяржуніверсітэта, характарызуецца яго сучасны стан. Пасля інфармацыйнага блоку разварот за разваротам пачынаецца прэзентацыя факультэтаў і адукацыйных устаноў, размешчаных у алфавітным парадку. Канцэпцыя гэтага выдання распрацавана такім чынам, каб зрабіць яго цікавым і карысным для ўсіх выкладчыкаў і студэнтаў, абітурыентаў, а таксама звычайных людзей, якія цікавяцца Беларуссю і яе найбольш значнымі нацыянальнымі сімваламі, адным з якіх, безумоўна, з'яўляецца Беларускі дзяржаўны універсітэт. Над альбомам працавалі фатографы С. Плыткевіч, А. Супрун, В. Шуба, Т. Хаміцэвіч. Курыраваў праект прарэктар нашага універсітэта У.Л. Клюня, адказным за яго быў У.А. Навумовіч.

ВІНШУЕМ!

СТУДЭНТЫ ГОДА Ў БДУ

4 пераможцы і 19 лаўрэатаў — такі вынік першага конкурсу "Студэнт года БДУ", праведзенага сёлета ўпраўленнем выхаваўчай работы з моладдзю. Званні "Студэнт года" атрымалі ў намінацыях: "Навука" — пяцікурсніца факультэта філасофіі і сацыяльных навук Ірына Пархоменка, "Лідэр" — студэнт V курса факультэта журналістыкі Андрэй Куціла, "Культура" — студэнтка II курса факультэта міжнародных адносін Вера Маркава, "Спорт" — студэнтка II курса юрыдычнага факультэта Кацярына Янушкевіч. Узнагароды яны атрымалі 31 кастрычніка на ўрачыстым пасяджэнні Вучонага савета ў гонар 85-годдзя БДУ.

Агулам у конкурсе прынялі ўдзел 40 чалавек. Дарэчы, такія творчыя спаборніцтвы цяпер будуць ладзіцца ў нашым універсітэце штогод.

СВАЁ КІНО

Андрэй Куціла паспяхова працуе ў Грамадскай інфармацыйнай службе. У 2005 годзе стаў сувыканаўцам праекта "Студэнцкая відэастудыя SVS". Фільм "Паэма веры", які ён зняў, атрымаў дыплом 1-й ступені ў намінацыі "Дакументальнае кіно" IV Міжнароднага маладзёжнага фестывалю відэафільмаў "Славянскае юнацтва: мары і надзеі", Масква, май 2006, а таксама дыплом IV Міжнароднага фестывалю праваслаўнага кіно і літаратуры "Пакроў" , Кіеў, кастрычнік 2006.

— На Вашу думку, хто такі лідэр?

— Той, хто можа іншых арганізаваць так, як яму патрэбна, і сам быць прыкладам. Я захапляюся рэжысёрамі, мастакамі, на якіх можна раўняцца, не паўтараючы іх. На мяне ўплывае кіно Таркоўскага, Бергмана, Антаніёні, усходніх рэжысёраў... І добрыя кнігі: літаратура заўсёды дае новыя ідэі для творчага пошуку.

У студэнцкім гарадку я кірую Грамадскай інфармацыйнай службай і Студэнцкай відэастудыяй SVS. Раблю тое, што мне падабаецца. Узнагародзілі, адзначылі — дзякуй: гэта адзін са стымулаў, але ні ў якім разе не мэта.

— А перамагчы на конкурсе грантаў — мэта?

— Грант — гэта грошы, якія можна выкарыстоўваць на праекты. Атрымалі ў мінулым годзе – зараз афармляем памяшканне. На асвятленне трэба яшчэ сродкі, на апаратуру. Калі зробім студыю, зможам выпускаць паўнавартасныя навіны пра універсітэцкае жыццё. Пакуль што здымаем асобныя сюжэты, якія не маюць дакладнай прывязкі да часу. Робім таксама невялічкія фільмы.

Мы марым, каб на экране ў галоўным корпусе пастаянна круцілі навіны, падрыхтаваныя нашай студыяй, каб студэнты мелі ўяўленне пра падзеі ў БДУ. Нядаўна правялі кастынг — выбралі вядучых, карэспандэнтаў, аператараў. Студэнт можа паспрабаваць сябе ў гэтай студыі як сцэнарыст, рэжысёр, акцёр...

Увесну адбудзецца адкрыты фестываль студэнцкіх відэафільмаў, арганізацыяй займаецца студгарадок разам з Мінгарвыканкамам. Прыняць удзел у ім можа кожны. Калі ёсць ідэі — прыходзьце, прапаноўвайце сцэнарый, на базе нашай студыі ўсё зробім.

ПРАКТЫЧНАЯ НАВУКА

На рахунку Ірыны Пархоменка каля 15 навуковых публікацый і безліч выступаў на універсітэцкіх, рэспубліканскіх, міжнародных навуковых канферэнцыях, 1-е месца ў 2004 г. і 2-е месца ў 2005 г. на Рэспубліканскім конкурсе навуковых прац студэнтаў ВНУ Беларусі, перамога на конкурсе грантаў БДУ у 2006-м...

Віктар Жыбуль. Калісьці было жаданне паступаць на факультэт журналістыкі, спрабавала пісаць. На ФФСН я атрымаю больш універсальную адукацыю: скончыўшы гэты факультэт, я здолею працаваць амаль у любой сферы.

— У цэнтры Вашай навуковай увагі — "інваліды ў грамадстве". Чаму?

— Я пачала займацца гэтай тэмай на першым курсе. Хацелася вывучаць актуальную для нашай краіны праблему: у сацыялогіі яна даследавалася мала. Некаторыя з выкладчыкаў ушкаюць, што не бяруся за вывучэнне глабальных тэарэтычных пытанняў. Але мяне больш цікавяць практычныя магчымасці рэалізацыі сацыяльных праектаў.

— Якім чынам сумяшчаеце навучанне і даследаванні?

— Наяўнасць часу залежыць ад жадання. Калі жаданне ёсць — час знойдзецца на ўсё. І на асабістае жыццё, і на тое, каб пачытаць мастацкую літаратуру...

— Што чытаеце?

— Апошнім часам захапілася мадэрнісцкімі і постмадэрнісцкімі кірункамі. Чытаю беларускую сучасную літаратуру, з паэтаў найбольш падабаецца

ВУЧУСЯ СПЯВАЦЬ СОЛЬНА

Вера Маркава мае каля 50 узнагарод, атрыманых на конкурсе эстраднай песні "Залатыя галасы", адкрытым фестывалі эстраднай песні "Калядная зорка", Фестывалі эстрады БДУ, "Арт-вакацыях", Міжуніверсітэцкім фестывалі студэнцкіх ініцыятыў, Міжнародным фестывалі папулярнай песні "Жамчужны рай" ды інш.

— Вы даўно займаецеся спевамі?

— З дзяцінства. Вучылася ў ліцэі пры кансерваторыі (сучасны каледж пры Беларускай акадэміі музыкі). Працягвала займацца музыкай у дзіцячай музычнай школе № 1, спявала ва ўзорным хоры "Тоніка". З хорам павандравала па Еўропе: Англію, Францыю, Германію ды іншыя краіны пабачыла.

Пасля заканчэння музычнай школы пачала займацца вакалам. У хоры прыстасоўваешся да агульнага гучання. Спяваць сольна — зусім іншая справа, тут ты — асоба, трэба навучыцца "падаваць сябе", авалодваць увагай і настроем публікі.

— Вы перамаглі на многіх вакальных спаборніцтвах. Як думаеце, чаму?

— У мяне ёсць мэта, і я сябе не шкадую. Я адчуваю падтрымку бацькоў, сяброў, універсітэта. На першы курс прыйшла са сваімі дыпломамі — выявілася, што ў БДУ мяне ведаюць, бо я прымала ўдзел у конкурсах, адным з арганізатараў якіх быў універсітэт. Я вельмі ўдзячная ўпраўленню культуры: там шмат мерапрыемстваў, дзе можна знайсці сябе. Напрыклад, у год, калі я паступіла, майму факультэту споўнілася 10 гадоў, таму з'явілася магчымасць выступіць у Палацы спорту, затым — на конкурсе "Міс БДУ—2005". Зараз удасканальваю майстэрства ў Студыі эстраднага вакалу БДУ.

Інтэрв'ю падрыхтавала Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ
Фота Сяргея СТРАЛКОЎСКАГА

"ХАЧУ АЛІМПІЙСКІХ МЕДАЛЁЎ"

Кацярына Янушкевіч уваходзіць у склад нацыянальнай зборнай па вольнай барацьбе. Перамогі ў конкурсе "Студэнт года" не чакала, але вельмі ёй узрадавалася.

— Калі пачалі займацца вольнай барацьбой?

— У восьмым класе нам прапанавалі секцыю па вольнай барацьбе. Пайшла "за кампанію", але ўцягнулася. З дзяўчат нашага класа, якія тады пайшлі "махаць кулакамі", я ў секцыі засталася адна. Праз 2 гады трапіла ў зборную.

— Ці праўда, што такі спорт — не жаночы занятак?

— Часткова. Тым не менш, прыемна адчуваць, што больш ніхто з дзяўчат гэтым не займаецца, а ты — можаш. Каманда добрая, заўсёды ёсць адданыя сябры.

— Зборы, спаборніцтвы займаюць шмат часу. Калі ж вучыцца?

— Даводзіцца паспяваць, іншы раз на месяц прыпадае па чатыры спаборніцтвы. Універсітэт ідзе насустрач: сесію падаўжаюць, вольнае наведванне дазволілі. Без барацьбы я сябе не ўяўляю, але спорт калі-небудзь для мяне скончыцца, таму добрая адукацыя патрэбна.

— Як знаёмыя ставяцца да Вашага захаплення?

— Аднакласнікі, з якімі часам сустракаемся, здзіўляюцца, што я дасюль не кінула спорт. Калі ў мяне з'яўляецца хлопец, першае, што пытаецца звычайна: "А ты мяне біць не будзеш?" Мама напачатку была супраць таго, каб я займалася сур'ёзна: я адразу пачала набіраць у вазе, мышцы раслі, плечы мянялі форму... Пасля змірылася. Цяпер бацькі ужо ганарацца, тата гасцям медалі мае паказвае.

— У чым адметнасць вольнай барацьбы як спорту?

— Ты змагаешся з жывым чалавекам: ён таксама думае, адчувае, штосьці робіць. Барацьба не толькі моц. Яшчэ — хуткасць, трываласць, тактыка, тэхніка, інтэгральная падрыхтоўка.

— Якія планы на будучыню?

— Я чалавек амбіцыйны: хачу на Алімпіяду патрапіць у 2008-м. Ну, а калі не паспею, то ў 2012-м абавязкова паеду. Хачу алімпійскіх медалёў!

ВЕДАЙ НАШЫХ!

КУРС – НА ТОКІО!

Каманды Белдзяржуніверсітэта занялі першае і другое месцы на IX камандных спаборніцтвах па праграмаванні сярод студэнтаў Заходняга рэгіёна (чвэрцьфінал сусветнага першынства). Трэцяе месца — у студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі. Агулам жа ў дзесятку прызёраў выйшлі каманды БДУ (3), БДУІР (1), Беларуска-Расійскага дзяржаўнага універсітэта з Магілёва (1), Расійскага універсітэта імя Канта (1), Латвійскага універсітэта (2), Тартускага універсітэта (1) і Вільнюскага універсітэта (1). Гэтыя каманды прымуць удзел у паўфінальных спаборніцтвах у Санкт-Пецярбургу, дзе за выхад у фінал будуць змагацца 85 камандаў з усяго свету. Фіналісты сустрэнуцца ў Токіо ў сакавіку— красавіку наступнага году.

У спаборніцтвах прымалі ўдзел 5 камандаў з універсітэтаў Літвы, 6 — з Латвіі, 5 — з Эстоніі, 7 — з Калінінградскай вобласці Расіі, а таксама 26 — з вядучых ВНУ Беларусі. Каманда Тбіліскага дзяржаўнага універсітэта выступала ў якасці госця.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

У ПАМЯЦІ ВУЧНЯЎ І КАЛЕГ

Сярод святочных мерапрыемстваў кастрычніка пэўнае месца занялі і навуковыя чытанні, прысвечаныя 100-годдзю з дня нараджэння прафесара М.А.Жыдовіч на філалагічным факультэце.

Марыя Андрэеўна — першая жанчына — доктар беларускай філалогіі. Яна пакінула пасля сябе вялікую спадчыну: "Нарысы па гісторыі беларускай мовы", "Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы: Марфалогія", "Бібліяграфічны указальнік літаратуры па беларускаму мовазнаўству", бібліяграфічны даведнік "Беларускае мовазнаўства" ды інш.

Пры непасрэдным удзеле М.А. Жыдовіч былі падрыхтаваныя і абароненыя 24 дысертацыі. Студэнты пачулі цёплыя словы і ўспаміны пра Марыю Андрэеўну ад яе дачкі — былой старшай выкладчыцы кафедры гісторыі беларускай мовы БДУ І.А. Каралёвай. Дзяліліся сваімі ўражаннямі вучні і калегі: член-карэспандэнт НАН Беларусі А.І. Жураўскі, прафесар Н.В. Гаўрош, дацэнты Э.Д. Блінава, З.А. Зяневіч. У чытаннях прынялі ўдзел таксама прафесар М.Р. Прыгодзіч, дацэнты І.А. Гапоненка, М.І. Свістунова, Г.І. Кулеш, ст.выкладчык Т.М. Смольская, дацэнт М.М.Аляхновіч (Брэсцкі дзяржуніверсітэт імя А. Пушкіна), дацэнт А.В.Солахаў (Мазырскі педуніверсітэт імя І. Шамякіна), прафесар Альдэнбургскага універсітэта (Германія) Гердт Хеншэл, студэнты-ўдзельнікі мовазнаўчых спецсемінараў.

Ірына МЯГЧЫЛА,
студэнтка III курса
філалагічнага факультэта

БДУ ў СМІ Беларусі

85-годдзе БДУ. Віншаванне прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі з нагоды 85-годдзя БДУ ("Советская Белоруссия", 31.10; "Народная газета", 01.11; "Минский курьер", 01.11). Гэтай знамянальнай падзеі быў прысвечаны шэраг інтэрв'ю з рэктарам Белдзяржуніверсітэта прафесарам Васілём Стражавым: "Белорусский государственный университет: от знания к познанию" (БелТА, 24.10); "У асяроддзі "інфармацыйнага цунамі" неабходна навучыць вучыцца" ("Звязда", 27.10); "Множество Василия Стражева" ("Обозреватель", 27.10); "Флагман не на словах, а па сутнасці" ("Настаўніцкая газета", 28.10); "Тяжело нести студенческий билет" ("Народная газета", 28.10), "Таблица умножения знаний" ("Советская Белоруссия", 31.10); "Понедельник – день тяжелый, или Один день из жизни ректора..." ("7 дней", 09.11). Таксама матэрыялы з гэтай нагоды — "История БГУ: заметки на полях" ("Обозреватель", 27.10); "Диплом с отличием" ("Советская Белоруссия", 27.10); "Его пример — другим наука" ("Народная газета", 27.10); "С днем рождения, БГУ!" ("Рэспубліка", 27.10); "На выставке "Наука и научно-инновационная деятельность" ("Знамя юности", 27.10); "Дваццаць пяць залатых медалёў за шэсць гадоў", "У адным шэрагу з Гарвардам", "Калектыўны намеснік дэкана, альбо Студэнцкі кантроль за якасцю адукацыі", "Лепшыя будатрадаўцы сталіцы — у Белдзяржуніверсітэце", "Выпадковасць або наканаванасць лёсу", "Нават пірожныя стануць карыснымі...", "Бібліятэцы універсітэта таксама 85!", "У мяне кожны артыст — і прыма, і зорка", "4 залы даўжынёй у 85 гадоў", "Дыскыплінаваць студэнта дапамогуць інфармацыйныя тэхналогіі", "Укласці веды ў камп'ютар" ("Настаўніцкая газета", 28.10); "Графиня" теории графов" ("Рэспубліка", 27.10); "Приглашает новый старый музей" ("Минский курьер", 31.10); "Студенты БГУ освобождены от занятий" (Белорусы и рынок", 30.10); "Вучань абавязаны ісці далей за свайго настаўніка" ("Настаўніцкая газета", 31.10); "БДУ будзе расці студэнтамі і будынкамі..." ("Звязда", 01.11); "Праздник БГУ..." ("Вечерний Минск", 01.11); "С компасом по Минску" ("Минский курьер", 02.11); "Музей — як абярэг" ("Настаўніцкая газета", 02.11); "В зачетке – 85" ("Знамя юности", 03.11).

Перамога камандаў БДУ ў чвэрцьфінале сусветнага першынства IX камандных спаборніцтваў па праграмаванні сярод студэнтаў — "Вечерний Минск", 10.11; "Рэспубліка", 10.11; "Шанс на главную победу" ("Рэспубліка", 03.11); "Студэнцкія каманды з трох беларускіх універсітэтаў будуць змагацца ў паўфінале сусветнага першынства па праграмаванні" ("Настаўніцкая газета", 09.11).

Святкаванне 80-годдзя ваеннага факультэту БДУ — "Минские адреса Георгия Жукова" ("Минский курьер", 04.11)

Наведванне БДУ Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Расіі ў Беларусі Аляксандрам Сурыкавым — "Посол России в гостях у студентов БГУ" ("Рэспубліка", 26.10); "Беларусь і Расія зацікаўлены ў адзінай адукацыйнай прасторы" ("Настаўніцкая газета", 28.10); "Учись у соседа!" ("Народная газета", 02.11).

А таксама пра мноства іншых падзеяў паведамлялася на старонках друку, інфармацыйнымі агенцтвамі БелТА, БелаПАН, ІНТЭРФАКС і ў праграмах радыё і тэлебачання.

Падрыхтавала прэс-служба БДУ

УНІВЕРСІТЭТ

23 лістапада 2006 года, № 19 (1949)

ВІНШУЕМ!

ДА ПЕРАМОГІ ПРАЗ "ЕЎРОПУ"

Будаўнічы атрад з Белдзяржуніверсітэта прызнаны лепшым па выніках гарадскога конкурсу "Працоўнае лета — 2006", арганізатарамі якога выступілі Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў ЦК ГА "БРСМ" і Мінскі гарадскі камітэт ГА "БРСМ". Уражаннямі ад перамогі на конкурсе падзяліўся камандзір будатрада, студэнт 4 курса гістарычнага факультэта БДУ, Аляксандр Ілюк:

— У наш атрад уваходзілі 18 юнакоў з розных факультэтаў: студэнты гістфака, ФПМІ, гуманітарнага факультэта і геафака. У атрадзе пераважалі іншагароднія студэнты, якія маглі падчас працы заставацца ў Мінску і жыць у інтэрнаце. На працягу аднаго працоўнага семестра мы працавалі на будаўніцтве сталічнага гатэля "Еўропа" і, прызнацца шчыра, не задумваліся пра перамогу ў конкурсе. Першае месца было для нас нечаканым. Дый даведаліся мы пра конкурс толькі ў самым канцы працы. На цырымоніі ўзнагароджання вельмі прыемна было пачуць, што мы лепшы будатрад і атрымаць граматы і белыя будаўнічыя камандзірскія курткі з нашыўкай "Лепшы будатрад 2006".

— Цяжка было змяніць разумовы труд на фізічны?

— Спачатку было нялёгка. Увесь першы працоўны тыдзень даводзілася насіць цяжкія мяхі з цэментам і іншымі будаўнічымі матэрыяламі пешшу на 8-ы паверх. Але неўзабаве тэхніку адрамантавалі, і наша работа стала больш простай і прадуктыўнай. Мы абліцоўвалі сцены, столі, падносілі матэрыялы, уцяплялі будынак, займаліся мантажом. Нават прынялі ўдзел у будаўніцтве эталоннага нумара аднаго з паверхаў. Адным словам, мы прайшлі будаўнічую школу ад падсобных рабочых да памочнікаў майстра.

— Ці было жаданне папрацаваць звыш нормы?

— Многія заставаліся пасля заканчэння працоўнага дня і працавалі звышурочна. Чаму ж не, калі ёсць сілы і ахвота? Некаторыя студэнты з нашага атрада пасля заканчэння семестра падоўжылі дагавор і працавалі на будаўніцтве "Еўропы" яшчэ месяц. Некалькі разоў мы дапамагалі будаўнікам на іншых аб'ектах бясплатна. Так, мы працавалі на будаўніцтве жылых дамоў у мікрараёне Малінаўка.

— Што вам прынёс удзел у будатрадзе?

— Канешне, досвед працы ў калектыве, новых сяброў, магчымасць карысна правесці час і зарабіць грошай. Заробак, дарэчы, мы ўсе атрымалі ў час і былі вельмі задаволеныя. На нас былі афармлены працоўныя кніжкі.

— А на адпачынак часу хапала?

— Так. Мы ўвесь вольны час праводзілі разам. Тым болей, што амаль усе хлопцы ў нашым атрадзе гулялі ў футбол. Прыкладна 2 разы на тыдзень мы сустракаліся на полі. Аднойчы ездзілі у паход. За гэты час мы сталі сапраўднымі сябрамі. Сумесная праца збліжае.

— Ці плануюць пераможцы працаваць у будатрадзе БДУ на наступны год?

— Шмат студэнтаў з нашай каманды жадаюць працаваць і надалей, і я, вядома, сярод іх. Для гэтага патрэбна ўсяго толькі прыйсці ў Штаб працоўных спраў БДУ і запісацца ў атрад.

Надзея КЛЕМЯНЦЁНАК

УЧЫНАК

ВЫРАТАВАЛІ З БЯДЫ

Курсанты ваеннага факультэта Міхаіл Трапашка і Андрэй Здановіч з інтэрната № 5 выратавалі 4-гадовага хлопчыка, які тануў.

Здарэнне адбылося 30 кастрычніка на беразе Свіслачы бліз вуліцы Кастрычніцкай. Дзіця гуляла па парапеце, трымаючыся за руку бабулі, але раптам звалілася ў раку. Пабачыўшы, як у ледзяной вадзе апынулася малеча, Міхаіл, не раздумваючы, скокнуў ратаваць яго. Андрэй дапамагаў яму з берага. Хлопчыка выратавалі, але Міхаіл сам пры гэтым прастыў. Бацькі дзіцяці прывезлі яму малінавага сочыва — лекавацца. Адзначыла ўчынак курсантаў і кіраўніцтва ваеннага факультэта: абодва героі атрымалі па наручным гадзінніку. Адміністрацыя студгарадка таксама выказала хлопцам сваю падзяку і шмат добрых слоў.

Паводле інфармацыі студгарадка
Фота Сяргея СТРАЛКОЎСКАГА

АКЦЫІ

ГОДНАЕ ДЗЯЦІНСТВА

Каардынацыйны савет студэнцкіх саветаў інтэрнатаў БДУ разам са студэнцкім гарадком нашага універсітэта ладзіць акцыю "Годнае дзяцінства" для выхаванцаў дзіцячых дамоў. Мерапрыемства адбудзецца ў два этапы. Якраз сёння, 23 лістапада, 50 студэнтаў-актывістаў з Белдзяржуніверсітэта адправіліся ў дзіцячы дом Слуцка, дзе жывуць каля 130 дзяцей. Для малодшых выхаванцаў гэтай установы яны падрыхтавалі гульнёвую праграму з конкурсам, для крыху больш дарослых дзяцей — псіхалагічны трэнінг у выглядзе гульні. Самыя старэйшыя гадаванцы прымуць удзел у круглым стале разам са студэнтамі БДУ — выхаванцамі дзіцячых дамоў. Гаворка пойдзе аб прафарыентацыі. Пасля ўсяго гэтага дзяцей чакае канцэрт.

Другая частка акцыі адбудзецца непасрэдна ў нашым універсітэце ў снежні 2006 г., калі да нас прыедуць 25 старшакласнікаў з дзіцячага дома. Для іх студэнты наладзяць экскурсію па універсітэце і яго музеях, а таксама раскажуць пра свае ўражанні ад вучобы і жыцця ў БДУ.

Паводле інфармацыі прэс-службы студгарадка БДУ

ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА

ДНІ ПСІХАЛОПІІ ДЛЯ МАТЭМАТЫКАЎ І ІНФАРМАТЫКАЎ

Практычныя мерапрыемствы "Дні псіхалогіі. У гасцях у ФПМІ" прайшлі 14—16 лістапада. Спецыялісты псіхалагічнай службы БДУ арганізавалі адпаведныя заняткі для студэнтаў усіх курсаў факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Акрамя таго была прадугледжана асобная праграма для студэнтаў I—II курсаў.

Падчас Дзён псіхалогіі адбыліся трэнінгі "Навыкі публічнага выступу і асновы аратарскага майстэрства. Самапрэзентацыя", "Пераможныя рашэнні. Развіццё творчых здольнасцяў", семінар "Здаём іспыт. Уводзіны ў стрэс-менеджмент і самарэгуляванне", дзелавыя і ролевыя гульні, алімпіяда па псіхалогіі, а таксама іншыя мерапрыемствы. Былі арганізаваны прэзентацыі, прысвечаныя магчымасцям сучаснай псіхалогіі, прынцыпам і нормам работы псіхолага, дзейнасці псіхалагічнай службы Белдзяржуніверсітэта. На брыфінгу студэнты змаглі атрымаць ад спецыялістаў адказы на пытанні з галіны псіхалогіі асобы, адносінаў паміж людзьмі, сацыяльнага ўзаемадзеяння. Акрамя таго, адбыўся аўкцыён псіхалагічных паслуг.

Паводле інфармацыі псіхалагічнай службы

КАНФЕРЭНЦЫІ

На базе гістарычнага факультэта 16—17 лістапада адбылася Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў факультэтаў ВНУ". Гістарычны факультэт — адзін з пілотных у нашым універсітэце па апрабацыі праграмы "Удасканаленне арганізацыі, забеспячэння і кантролю якасці самастойнай работы студэнтаў", якая з'яўляецца адной з галоўных у комплексе мер па развіцці БДУ да 2011 г.

У працы канферэнцыі прынялі ўдзел прадстаўнікі вышэйшай школы з Санкт-Пецярбурга, Масквы, Перміі, Омска, Екацярынбурга, Стаўрапаля, Валгаграда, Казані (Расія), Днепрапятроўска, Львова, Запарожжа (Украіна), Мінска, Гомеля, Гродна, Брэста, Віцебска, Баранавічаў (Беларусь), Бішкека (Кыргызстан). Навукоўцы абмеркавалі актуальныя праблемы арганізацыі самастойнай работы студэнтаў: паняцце самастойнай работы і яе формы; методыку правядзення; выкарыстанне новых педагагічных тэхналогій у навучальным працэсе (модульна-рэйтынгавай і рэйтынгавай сістэмаў, метад праектаў, партфоліо); інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі; тэставыя асяроддзі і тэставы кантроль ведаў; формы, метады кантролю і методыку ацэнкі. Быў падагулены досвед па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў розных ВНУ Беларусі, Расіі, Украіны.

***

Кафедра сучаснай беларускай мовы філалагічнага факультэта БДУ сумесна з Міжнароднай асацыяцыяй беларусістаў 16—17 лістапада 2006 г. правяла V Міжнародную навуковую канферэнцыю "Мова — Літаратура — Культура", прысвечаную 80-годдзю з дня нараджэння вядомага мовазнаўцы Льва Міхайлавіча Шакуна.

У працы канферэнцыі прынялі ўдзел больш як 250 чалавек, у тым ліку славісты з Аўстрыі, Венгрыі, Германіі, ЗША, Літвы, Польшчы, Расіі, Славакіі, Украіны, Швейцарыі, Эстоніі. Дзейнасць навукоўцаў была арганізаваная па 14 секцыях, у тым ліку такіх, як "Актуальныя праблемы гісторыі беларускай мовы", "Нармалізацыя сучаснай беларускай мовы: вуснае і пісьмовае маўленне", "Аспекты моўных даследаванняў" і інш. Упершыню быў зладжаны круглы стол "Беларуская мова як замежная", прысвечаны праблемам выкладання беларускай мовы іншафонам.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

ПАДПІСКА

Пачалася падпіска на перыядычныя выданні на першае паўгоддзе 2007 года. Падпісная цана на часопіс "Веснік БДУ" па серыях:

Серыя I — **фізіка, матэматыка, інфарматыка (№ 1, студзень; № 2, май):**

індывідуальная (індэкс 74851) — 18 550 р. (Белпошта), 17 170 р. (Белсаюздрук);

ведамасная (індэкс 748512) — 56 268 р. (Белпошта), 52 623 р. (Белсаюздрук);

Серыя II — **хімія, біялогія, геаграфія (№ 1, люты; № 2, чэрвень):**

індывідуальная (індэкс 74852) — 18 550 р. (Белпошта), 17 170 р. (Белсаюздрук);

ведамасная (індэкс 748522) — 56 268 р. (Белпошта), 52 623 р. (Белсаюздрук);

Серыя III — **гісторыя, філасофія, псіхалогія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права (№ 1, сакавік):**

індывідуальная (індэкс 74853) — 9 270 р. (Белпошта), 8 590 р. (Белсаюздрук);

ведамасная (індэкс 748532) — 28 134 р. (Белпошта), 26 311 р. (Белсаюздрук);

Серыя IV — **філалогія, журналістыка, педагогіка (№ 1, красавік):**

індывідуальная (індэкс 74854) — 9 270 р. (Белпошта), 8 590 р. (Белсаюздрук);

ведамасная (індэкс 748542) — 28 134 р. (Белпошта), 26 311 р. (Белсаюздрук);

Падпісацца на часопіс "Веснік БДУ" можна ва ўсіх аддзяленнях паштовай сувязі і крамах "Белсаюздрук" Рэспублікі Беларусь.

Рэдакцыя і рэдкалегіі часопіса

АНОНС

Штогадовы студэнцкі "Кірмаш вакансій" адбудзецца 29 лістапада ў актавай зале галоўнага корпуса Белдзяржуніверсітэта (праспект Незалежнасці, 4, 4-ы паверх). Плануецца, што ўдзел у ім прымуць каля 80 прадпрыемстваў Мінска. Арганізуе мерапрыемства камітэт БРСМ нашага універсітэта.

Паводле інфармацыі ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю

З УСМЕШКАЙ

Чаго не зразумеў на лекцыі — зразумееш на экзамене.

***

Студэнты, памятайце: усё, сказанае вамі на экзамене, можа быць скарыстана супраць вас!

***

— Не, не і не! — крычыць галоўны рэдактар студэнту-журналісту. — У вас атрымаўся вельмі доўгі рэпартаж. Выкіньце ўсе непатрэбныя падрабязнасці.

Праз паўгадзіны журналіст прыносіць тэкст:

— Кіроўца "Фальксвагена" вёў аўтамабіль па мокрай шашы з хуткасцю 120 кіламетраў у гадзіну. Пахаванне заўтра а 15-ай.

***

Прыходзьце на экзамены са свежай галавой: шмат з чым давядзецца разбірацца ўпершыню.

***

Выкладчык:

— Давайце парадуемся за тых, хто сёння з намі, і зробім пераклічку.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты — Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

23 лістапада 2006 года
Падпісана да друку 22.11.2006 г.
Зак. 1062 . Тыраж 1000 экз.Ум. друк. арк 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная рэдакцыі: вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by